**ЛАКАНІ́ЗМ** (грэч. lakōnismos), гранічная эканомія моўных сродкаў у выражэнні думкі. Падпарадкаваны дзейнасці закону «моўнай эканоміі» і знешне праяўляецца ў скарачэнні лінейных памераў выказвання (колькасці слоў) пры захаванні або нават павелічэнні яго зместавага аб'ёму (колькасці інфармацыі). Уласцівы *афарызмам* і крылатым словам. У вуснай нар. творчасці Л. — вызначальная адзнака малых празаічных жанраў (*прыказка, загадка*, нар. *прыкметы, выслоўі, праклёны*). Абумоўлівае жанрава-кампазіцыйныя формы *анекдота, жарту*, дыдактычных ці гумарыстычных апавяданняў. Л. мовы фальклору вынікае з сэнсавай ёмістасці лексічных кампанентаў фразы за кошт пашырэння значэння («Ад хлеба не шукаюць хлеба»), пераасэнсавання («Каша сама сябе хваліць»), а таксама невялікага сінтаксічнага аб'ёму выказвання: абмежавання ці адсутнасці даданых членаў сказа («Спроба не хвароба»), выкарыстання аднасастаўных, няпоўных і эліптычных сказаў («Ажаніцца —

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

не ўпасці»), ужывання бяззлучнікавых і складаназлучаных сказаў («Андрэй-канарэй, не лятай за лясок: там кошку дзяруць, табе ножку дадуць»), паўтораў («Гора скача, гора плача, гора песенькі пяе»), паралелізму («Стары кажа на глум, а малады бярэ на вум») і г.д. Знешні фактар Л. фалькл. тэкстаў — неабходнасць іх захавання і ўзнаўлення ў вуснай форме.

*Літ.*: Тамашэвіч Т. І. Сцісласць маўлення // Асновы культуры маўлення і стылістыкі. Мн., 1992.

*Я. Я. Іваноў.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова